


# *РАЗГАДАЦЬ СВАЁ ПАКЛІКАННЕ*

**«Знайсці сябе» – так назвала сваю новую кнігу, зборнік нарысаў наша калега па Саюзе пісьменнікаў Беларусі, журналіст, краязнаўца, публіцыст Галіна Антонава (Смаргонь). Выданне пабачыла свет напрыканцы 2024 года.**

«Знайсці сябе» – кніга смаргонскай журналісткі Галіны Антонавай. У кнігу ўвайшлі матэрыялы пра таленавітых, апантаных людзей Смаргоншчыны і не толькі. Аўтар запрашае чытачоў адчуць непаўторнасць характару кожнага з герояў кнігі, даведацца пра іх формулу поспеху. Кніга – своеасаблівы дапаможнік для тых, хто хоча «разгадаць» сваё пакліканне і знайсці сваё месца пад сонцам.

*Анатацыя*

***

Змест новай кнігі члена Саюза пісьменнікаў Беларусі і Беларускага саюза журналістаў Галіны Антонавай, зборніка нарысаў «Знайсці сябе» складаецца з 24 нарысаў, якія ў свой час пабывалі газетнымі рэпартажамі, а таксама з некалькіх пустых старонак для пазнак. Уступны артыкул да кнігі напісаў ганаровы грамадзянін Смаргоні, вядомы скульптар Уладзімір Церябун. Кніга багата аздоблена каляровымі фотаздымкамі высокай якасці, налічвае больш за 140 старонак. Пераплёт цвёрды. Тыраж 99 асобнікаў. Выдавец і паліграфічнае выкананне – Адкрытае акцыянернае таварыства «Друкарня «Перамога»», г. Маладзечна. Галоўны рэдактар Алена Барташ. Згодна творчай стратэгіі аўтара кнігі «Знайсці сябе», беларускай журналісткі, пісьменніцы Галіны Антонавай яе нарысы апавядаюць пра жыццё Смаргонскага краю і цікавыя лёсы яго жыхароў.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**